прашаптала жонка. – Нічога тады не бойся. Гэта буду я” [3]. На гэтым размова завяршаецца, і героі застаюцца ў начной цішыні са сваімі думкамі сам-насам: “Пляла свае чорныя карункі ноч. Спаў горад-вуркатун. У ціхай спальні плакалі найчысцейшымі слязамі дзве родныя душы” [3].

Не менш цікава ў творы таксама арганізавана прастора. Дзеянне ў “Герадоцінках” не абмяжоўваецца нейкім адным канкрэтным месцам, а сумяшчае самыя розныя топасы – ад Старажытнай Грэцыі да Беларусі. А вось калі браць пад увагу групу фрагментаў, якую складаюць афарызмы альбо кароткія выслоўі, то тут прасторавыя характарыстыкі адсутнічаюць увогуле: “Прабачце мне, не прачытаныя мною кніжкі!” [3]; “Толькі той, хто мысліць, свабодны і самастойны” [3]; “Матчына крыло і ў мароз цёплае” [3].

З гэтага вынікае, што “Герадоцінкам” Л. Дайнекі няма неабходнасці ў сувязі дзеяння, месца і часу. Фрагментарная проза паслядоўна змяншае важнасць адзначаных катэгорый, не дапускаючы пры гэтым разбурэння цэласнасці тэксту. Твор Л. Дайнекі ўяўляе сабою не столькі суцэльны сюжэт, колькі згустак асобных разважанняў, канцэптаў ці сэнсаў. Мастацкая арганізацыя часу і прасторы “Герадоцінак” дазваляе чытачу альбо самому аўтару змешваць фрагменты ў адвольным парадку, выкідваць непатрэбнае ці, наадварот, дадаваць нешта новае, не баючыся парушыць першапачатковую задуму ці страціць галоўную ідэю. Асноўнымі характарыстыкамі хранатопу твора з’яўляюцца змешванне часоў і прастор, а таксама імкненне да нулявой тэмпаральнай мадэлі. Да гэтага трэба дадаць, што самі фрагменты не валодаюць завершанай структурай, таму кожны з іх здольны існаваць самастойна ці стаць падмуркам для больш буйнога твора.

**Літаратура**


1 Грешных, В. Художественная проза немецких романтиков: формы выражения духа: автореф. дис. на соиск. уч. степ. док. филол. наук: 10.01.03 / В. Грешных; МГУ им. М. В. Ломоносова. – Москва, 2001. – 309 с.

2 Горалик, Л. Фрагментарная проза: от Новалиса до “Живого журнала” / Л. Горалик // НЛО. – 2002. – № 54. – С. 10−19.

3 Дайнека, Л. Герадоцінкі [Электронны рэсурс] / Л. Дайнека. – Рэжым доступу: http://www.daineka.by/be/tvory/gerad-1/geradotinki-r. − Дата доступу: 12.04.2016.

4 Бахтин, М. Формы времени и хронотопа в романе. Очерки по исторической поэтике / М. Бахтин // Вопросы литературы и эстетики. – М.: Художественная литература, 1975. – С. 234–407.

5 Николаев, А. И. Основы литературоведения : учебное пособие для студентов филологических специальностей [Электронный ресурс] / А. И. Николаев // Издательство Листос. – Иваново, 2011. – Режим доступа: http://www.listos.biz/филология/николаев-а-и-основы-литературоведения/анализ-художественного-пространства-и-времени. – Дата доступа: 24.04.2016.



**УДК 821.161.3 - 1**



***Н. В. Канцавая***


## ПОБЫТ БЕЛАРУСКАЙ ШЛЯХТЫ ПРАЗ ПРЫЗМУ ТВОРАЎ В. БАБКОВАЙ І Л. РУБЛЕЎСКАЙ


*Артыкул прысвечаны выяўленню гісторыі штодзённасці беларускай шляхты XVII – XVIII стагоддзяў, адлюстраванай у мастацкай (творы Л. Рублеўскай, В. Бабковай) і навуковай (работы А. Мальдзіса, В. Ракіцкага, А. Смалянчука, Н. Сліж) літаратуры. Гісторыя штодзённасці ў наш час стала асобнай галіной гуманітарнай навукі. Пад*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*гісторыяй штодзённасці ў мастацкай літаратуры мы разумеем апісанне побыту, этыкету, нацыянальных страў, строяў.*

Гісторыя штодзённасці таго ці іншага народа складваецца на працягу стагоддзяў. Вывучаючы гісторыю штодзённасці, мы даведваемся, як паступова змяняўся побыт, вопратка, паводзіны, традыцыі таго ці іншага народа.

Да вывучэння гісторыі штодзённасці звяртаюцца даследчыкі А. Мальдзіс, В. Ракіцкі, А. Смалянчук, Н. Сліж. Побыт беларускай шляхты пададзены ў творах Ул. Караткевіча, Л. Рублеўскай, В. Бабковай.

В. Бабкова ў сваёй кнізе гістарычных эсэ «…І цуды, і страхі» спрабуе перадаць атмасферу жыцця Беларусі даўніх часоў. На старонках гэтай кнігі ажываюць вобразы самых звычайных людзей XVIII стагоддзя. Пісьменніца наступным чынам апісвае мужчынскую шляхецкую вопратку: «Срэбны пазалочаны сыгнет, чорны каўпак, лісой падшыты, саф'янавыя боты, новы шары ермяк са шнурамі і стракою чорнага шоўку, жупіца ласіная, бавоўнаю падшытая, ды ашчэп звярыны лоўчы, для палявання годны» [1, с. 102], «унуку ж Ярашу дасталіся дылея лазуровая з вялікімі гузікамі ды макавы жупан» [1, с. 22].

Л. Рублеўская ў сваёй трылогіі «Авантуры Пранціша Вырвіча» апавядае пра шэраг цікавых і малавядомых фактаў пра жыццё і побыт Беларусі XVIII стагоддзя. У трылогіі пададзены вельмі падрабязныя апісанні шляхецкай вопраткі: «Князь Геранім быў у сармацкім строі: цёмна-сіні кунтуш з залатымі шнурамі, кармазынавы жупан з дыяментавымі гузамі падперазаны шыкоўным літым пасам, такія ткалі тут жа, на славутай слуцкай персіярні, сабаліная шапка з велізарным дыяментам. Шабля-карабэла пералівалася рубінамі і смарагдамі» [2, с. 98], «незнаёмец у чорным капелюшы з высокай тулляй, абвязанай блакітнай стужкай, у чорным каптане, з-пад якога бачыліся бялюткія карункавыя манжэты і каўнер-жорнаў, спускаўся па лесвіцы» [2, с. 37], «на абодвух плячыстых вусатых гасцях былі жупаны з блакітнага атласу, саетавыя кунтушы саламянага колеру, срэбныя паясы, жоўтыя саф'янавыя боты, чырвоныя шаравары ды блакітныя шапкі з аколышам з крымскай мярлушкі» [3, с. 38].

А. Мальдзіс, які адным з першых звярнуўся да вывучэння гісторыі штодзённасці, у эсэ «Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі» згадвае тыя элементы традыцыйнай шляхецкай вопраткі, якія сустракаюцца і ў творах Л. Рублеўскай і В. Бабковай: «Асноўнымі часткамі «мужчынскага гардэроба» да сярэдзіны XVIII стагоддзя з'яўляліся кунтуш, жупан і штаны («порткі»). Кунтуш – гэта нешта накшталт каптана або світкі, верхняя апратка з характэрнымі «разразнымі рукавамі». У пачатку стагоддзя кунтушы насілі вузкія і доўгія, амаль да зямлі. Часам шарсцяная тканіна «падбівалася» футрам – і тады яны служылі нечым накшталт сённяшняга паліто. У 40–50-я гады кунтуш стаў крацейшым (да калена) і лягчэйшым – шылі яго нават з бавоўняных і шаўковых тканін. Пад кунтуш звычайна паддзяваўся жупан. На яго ішлі больш лёгкія тканіны – шоўк, паркаль. Даўжынёй ён быў такі ж, як і кунтуш. Зверху кунтушы абавязкова падпяразваліся паясамі» [4, с. 326–327].

Адсюль мы бачым, што ў мужчынскім шляхецкім адзенні вылучаліся жупан, кунтуш, які падпяразваўся поясам, камзол і боты.

Н. Сліж у артыкуле «Штодзённыя патрэбы асобаў шляхецкага саслоўя ў Вялікім Княстве Літоўскім XVI стагоддзя і асаблівасці іх задавальнення» таксама ўзгадвае некаторыя элементы мужчынскага шляхецкага адзення: футра, каберцы, каяны, кажухі. Даследчыца піша, што неадменным элементам шляхецкага выгляду была зброя: «Да адзення мужчын дадаваліся сярод іншага зброя і даспехі. У штодзённым жыцці шляхціц звычайна меў з сабой шаблю, а іншыя віды зброі патрэбны былі яму толькі пры вайсковых дзеяннях ці пры нападзе на суседзяў або падарожнікаў» [5, с. 61].

Узброены шляхціц у рамане Л. Рублеўскай «Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча» выглядае наступным чынам: «Русявы чуб зухавата выбіваўся з-пад шапкі, пры левым

РЕПОЗИТОРИЙ УДУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

баку пагрозна паблісквала шабля, а чырвоныя боты нахабна рыпелі і цокалі па каменнай падлозе падкоўкамі» [3, с. 17].

А. Мальдзіс у сваёй працы таксама апісвае згаданы шляхецкі абутак: «Боты шыліся тады трох колераў: жоўтыя, чырвоныя і чорныя. Халява ў бота была кароткая, закрывала ззаду толькі лытку, спераду ж, даўжэйшым ад задняй часткі канцом, віхлярам званым, – палавіну калена. Прасторная халява, разлічаная так, каб змясціць шырокія нагавіцы портак, складалася нібы з дзвюх палавінак, сшытых па баках. Напятак у бота быў умацаваны драўляным лубам, засаджаным паміж скурамі, – каб не выкрыўляўся і не моршчыўся; пад напяткам – жалезная падкоўка таўшчынёй у тры пальцы, у паноў беленая або нават сярэбраная, у бедных жа слуг толькі напільнікам крышку выгладжаная» [4, с. 330].

Вельмі прыгожай выглядае шляхцянка ў апісаннях В. Бабковай: «Уражвае сваёй разнаітасцю ды выкшталцонасцю асабліва жаночае адзенне: брамка з пунталамі срэбнымі і залацістымі, брамка чорная аксамітная з пунталамі дробнымі залацістымі, паясы аксамітныя з срэбнымі цаткамі, на якіх цатак сорак сем без зангля, жупан ландышовы лазуравы, зялёным кірам падшыты, дылея бурнатная, куніцавым футрам падшытая, з дробнымі срэбнымі дротавымі гузікамі, другая – з гузікамі ядвабнымі. Жоўтая куртка са скуры лася, зялёным кірам падшытая, з устаўкамі чырвонага аксаміту, куртка пурпуровая з чырвоным аксамітам ад падолу да пасу з двума тузінамі залатых гузікаў. Два жупаны аксамітныя – чорны ды вішнёвы, па гусарску ўшытыя, а другі жупан – зялёны, ушыты па-казацку. Пояс срэбны панцаравы, адліваны ўшыркі на два пальцы» [1, с. 103].

Л. Рублеўская надае асасаблівую ўвагу апісанню адзення паненак XVIII стагоддзя: «Прываблівала пагляд падобнай да вялізнага торта з крэмавымі кветкамі сукенкай-рагоўкай на абручах з кітовага вуса, з найmaднейшай ружова-блакітнай тканіны ў дробныя букецікі, як у фаварыткі французскага караля мадам Пампадур. Сукенка была “лакцёвай” – у ёй нельга апусціць рукі, даводзілася трымаць іх сагнутымі ў локцях, не ў кожныя дзверы ўвойдзеш, а з шоўку, што пайшоў на гэты ўбор, можна было пашыць прынамсі тры сукенкі звычных памераў» [2, с. 38–39], «белая сукенка з шоўку і карункаў, неверагодна тонкі стан, зацягнуты ў гарсэт, высокі парык, упрыгожаны перлінамі» [2, с. 107], «кабета ў кунтушыку з цёмна-зялёнага шоўку, уздзетым на светлую сукню, у парыку, прыкрашаным толькі зялёнай стужкай… Па-праўдзе, кабета ў сціплым, але густоўным уборы магла апрануць радно альбо сает з залатой парчы, і аднолькава падавалася б казачнай каралевай» [3, с. 18].

Падмацаваць апісанне Л. Рублеўскай можна словамі з даследавання А. Мальдзіса: «Дзесьці ў 40–50-я гады традыцыйныя верхнія «накрыцці», юпкі і казакіны былі выцеснены доўгімі, аж да пят, салопамі, шытымі з чорнай кітайкі і падшыванымі футрам або чырвоным атласам. Услед прыйшла чарга кароткіх, да пояса, паўсалопаў, лёгкіх мантылек. Потым стала моднай рагоўка – спадніца з палатна, да якой падшываліся тры абручы з кітовага вуса – адзін у поясе, другі ў каленях, трэці ў палавіне лыткі. Абручы тыя былі не круглыя, як на бочцы, але прыплюшчаныя, падоўжныя – накшталт авальнай ванны. Дамы, што насілі рагоўку, спачатку апраналі спадніцу з тканіны, лёгкую або падшытую – у залежнасці ад пары года; на яе ўздзявалі рагоўку, а на тую ўсцягвалі прасторную сукенку, якая была ў модзе. Насіць рагоўкі дазвалялася толькі шляхцянкам» [4, с. 336].

Далей А. Мальдзіс дадае, што ў час небяспекі мужчына мог схавацца пад рагоўку жанчыны, і такім чынам баязлівец заставаўся не кранутым ніякімі злодзеямі.

А. Мальдзіс падае і апісанне жаночага абутку: «Для яе шыюцца чаравікі – замшавыя і шаўковыя, вышываныя і маляваныя, упрыгожаныя спражкамі і каштоўнымі каменнямі» [4, с. 337].

З трылогіі Л. Рублеўскай мы даведваемся пра парык, які з’яўляўся штодзённым упрыгожваннем шляхцянак: «Яе цёмныя валасы былі схаваныя пад высокім напудраным

парыком, у якім гняздзіліся па-майстэрску выкананыя мініяцюрныя блакітныя птушачкі» [2, с. 39–40], «у напудраным парыку, нагадваючы пра незвычайнае паходжанне дамы, замест штучных птушак ці кветак віліся зялёныя бліскучыя змейкі, на шчасце, таксама штучныя» [3, с. 108–109].

Адносна гэтага жаночага аздаблення А. Мальдзіс зазначае, што ў пачатку XVIII стагоддзя маладыя шляхцянкі ўпрыгожвалі косы, пераплятаючы іх стужкамі і аздабляючы жывымі або шаўковымі кветкамі. Дзяўчаты прышпільвалі да галавы маленькія капялюшыкі і «розныя птушачкі з шоўку». Вось што піша даследчык пра з’яўленне парыкоў: «Замужнія ж кабеты косы абразалі, прыкрывалі валасы каптурыкамі і чэпчыкамі («карнетамі»). З сярэдзіны стагоддзя тое ж самае пачалі рабіць і дзяўчаты. Урэшце, адсутнасць валасоў і неахайнасць прычоскі сталі прыкрываць напудранымі парыкамі ці пышнымі шыньёнамі» [4, с. 339].

З твораў Л. Рублеўскай мы бачым, што парыкі насілі таксама і мужчыны: «На Лёдніку быў акуратны парык, сіні камзол, расшыты срэбрам, белыя панчохі, чаравікі» [3, с. 239], «зняў камзол, застаўшыся ў белай кашулі і пералівіста-срэбнай камізэльцы, сцягнуў парык, і цёмныя валасы, перавязаныя стужкай, упалі на спіну» [3, с. 244].

А. Мальдзіс таксама апісвае, як выглядаў шыньён у XVIII стагоддзі: «Шыньёны – гэта страшэнна высокія шапкі, з палатна шытыя, ватай або і пакуллем выпханыя; яны рабілі галаву ўдвая вышэй, чым яна была на самой справе. Насадзіўшы тыя шыньёны на верх галавы, прыкрывалі іх навокал, спераду і ззаду, валасамі, гладкам уверх зачасанымі і прыпудранымі, а калі каму не хапала сваіх валасоў, падбіралі да іх чужыя такога ж колеру, які мелі ад нараджэння самі» [4, с. 339–340].

У Л. Рублеўскай сустракаем апісанне застольных страў і напояў шляхты: «Рубцы з анісам, шалтаносы, юц, бэбах, пячыста, крыпаная грыбамі… Пані Саламея прыпасла і калядныя стравы – бо Нараджэнне Хрыстовае сям’я не змагла сустрэць разам. Пернікі, паліваныя featзнакаляровай глазурай, з карыцай ды бергамотам, ды сліжыны з макавым малачком раставалі ў роце… Смачныя былі і вішнёвая налівачка, і прыхаваная бутэлька сапраўднай мальвазіі, віна, якое пілі рымскія цэзары, і ў бочцы з якім кароль Рычард Трэці ўтапіў свайго брата, хаця, хутчэй за ўсё, ачарнілі няшчаснага караля, як і віленскага доктара» [2, с. 258], «птахі з выкручанымі крылцамі і шыямі, фаршыраваныя грыбамі і садавінай, шчупакі, з галавы адвараныя, у сярэдзіне запечаныя, з хваста засмажаныя, парсючкі з прыстаўленымі крыламі» [2, с. 104].

У эсэ А. Мальдзіса таксама ўзгадваюцца некаторыя названыя вышэй застольныя стравы: «На другое ішло мяса – смажанае, печанае, варанае. На стол ставіліся дзве або тры велізарныя місы з пірамідамі, укладзенымі з рознай смажаніны, – іх уносілі двое гайдукоў, бо адзін не ўзняў бы. У нізе той піраміды былі два вялікія кавалкі засмажанай ялавічыны, на іх ляжала адна і другая чвэртка цяляціны, затым – бараніна, потым – індыкі, гусі, каплуны, курчаты, курапаткі, бакасы – чым вышэй, тым меншае птаства. У пост падавалі на стол рыбу, бабровыя хвасты. Не грэбавалі і рознай “брыдотай” – слімакамі, жабамі, чарапахамі, вустрыцамі, курынымі грабянцамі, прыпяканымі над свечкай» [4, с. 353–354].

У застольныя стравы для паляпшэння смаку абавязкова дадавалі разнастайныя прыправы: шафран, імбір, перац, карыцу, гваздзіку. Пра гэта таксама піша Л. Рублеўская: «Нагадвала стол, накрыты па старажытным звычаі, калі мяса абавязкова падавалася пад чатырма падліўкамі: жоўтай, з шафранам… чырвонай, з вішнямі… і шэрай, з варанай цыбулі» [3, с. 60].

Даследчыца Н. Сліж апавядае пра аналагічныя асаблівасці харчавання шляхціцаў: «Яны не толькі спажывалі свежае мяса, але і ўмелі кансерваваць яго. Для шляхты былі даступныя соль і разнастайныя прыправы (імбір, перац, шафран, карыца (цынамон), гваздзіка і інш.). Усё гэта куплялася на кірмашах» [5, с. 54].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Такім чынам, творы беларускай літаратуры дазваляюць нам пранікнуць у жыццё людзей таго часу, узнавіць яго каларыт і атмасферу, адчуць сябе ў асяроддзі тагачаснага штодзённага побыту.

**Літаратура**

1 Бабкова, В. У. …І цуды, і страхі. Эсэ па гісторыі штодзённасці Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVII стагоддзяў / В. У. Бабкова. – Мінск: І. П. Логвінаў, 2010. – 152 с.

2 Рублеўская, Л. І. Авантуры студыёзуса Вырвіча. Раман прыгодніцкі і фантасмагарычны / Л. І. Рублеўская. – Мінск: Звязда, 2014. –320 с.

3 Рублеўская, Л. І. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега. Раман прыгодніцкі і фантасмагарычны / Л. І. Рублеўская. – Мінск: Звязда, 2012. – 271 с.

4 Мальдзіс, А. В. Культура матэрыяльная / А. В. Мальдзіс // Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі. – Мінск: Лімарыус, 2002. – 384 с.

5 Сліж, Н. Гісторыя беларускай штодзённасці / Н. Сліж // Arche. – 2003. – № 3. – С. 53–65.

**УДК 316.344.3**

***Н. П. Климович, В. И. Белоусов***

## ОБ УРОВНЕ СФОРМИРОВАННОСТИ БАЗОВЫХ ФИЗКУЛЬТУРНЫХ ЗНАНИЙ СТУДЕНТОВ ФАКУЛЬТЕТА ФИЗИЧЕСКОЙ КУЛЬТУРЫ

*Статья посвящена исследованию уровня сформированности базовых физкультурных знаний студентов факультета физической культуры УО «ГГУ им. Ф. Скорины». Установлено, что уровень сформированности базовых физкультурных знаний студентов факультета физической культуры «хороший». Уровень сформированности теоретических знаний студентов «очень хороший», методических знаний – «удовлетворительный», практических знаний – «очень хороший».*

Физкультурные знания являются важным элементом физической культуры человека, определяющим его способность осуществлять адекватную двигательную деятельность, а так же процесс физического самовоспитания. В свою очередь физическая культура обеспечивает адекватность учебной и профессиональной деятельности человека.

Особый интерес представляет исследование уровня сформированности базовых физкультурных знаний студентов факультета физической культуры и сравнение его с уровнем сформированности аналогичных знаний студентов не физкультурных специальностей.

Измерение уровня сформированности физкультурных знаний студентов требует разработки надежного диагностического инструментария, обеспечивающего научно обоснованный и метрологически корректный контроль за уровнем сформированности у студентов базовых физкультурных знаний [1].

Измерение уровня сформированности физкультурных знаний осуществлялось нами с использованием методики, разработанной доцентом В. Н. Старченко.

Диагностика состояния базовых физкультурных знаний студентов включает в себя специальную анкету и методику интерпретации ее результатов. Вопросы анкеты подобраны по принципу минимальной сложности и только на основе материала школьной программы по физическому воспитанию.

Цель исследования заключалась в определении уровня сформированности базовых физкультурных знаний студентов факультета физической культуры УО «Гомельский

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ